***Пакруча́стыя касмылі́ по́ўсці*** *(разм.)* — скудлачаныя пасмы валасоў.
***Ваdóк*** — доўгая града́ згрэбенага сена.
***Валкава́ць*** — зграбаць сухую скошаную траву ў валкі́.
***Перайна́чыць*** — змяніць, зрабіць іншым.



## МІХАСЬ ДАНІЛЕНКА

## Маленькі фермер

Вёска Росіца невялікая — усяго дванаццаць двароў. Сюды Максімкавы бацькі́ пераехалі з горада. Тата адрамантаваў даўжэзны цялятнік: перакрыў лістамі шыферу, зрабіў новыя за́гарадкі, паілкі для цялят. Пад паве́ць паставіў трактар з прычэпам. Калі ўсё было зроблена, ён задаволена паляпаў Максімку па плячы.

— Будзеш нашым памочнікам, — сказаў бацька. — Заўтра прыгонім з Сяргеем бычкоў.

Сяргей — старэйшы Максімкаў брат. Ён ужо перайшоў у восьмы клас. Раней у горадзе школа была побач. Цяпер жа трэба хадзіць кіламетраў за восем. Побач са школай ёсць вялікая ферма, адкуль раніцай прыгналі бычкоў — пярэсценькіх,



Правообладатель Национальный институт образования

з пакручастымі касмылямі поўсці над шырокімі лбамі.

І пабеглі, закруціліся ў бясконцай працы дні. Бацька наладжваў электрапастуха: на ўкапа́ныя слупы нацягваў дрот — агароджваў участак, дзе пасвіліся бычкі. А яшчэ трэба было касіць траву, чысціць летні загон, вазіць тарфакрошку на подсціл. Добра, што Сяргей дапамагаў бацькам. Ды і Максімка часта пакіда́ў свае караблікі на рачулцы і бег прыглядваць за бычкамі, каб не ўбіліся дзе ў канюшы́ну.

— Што б мы рабілі тут без цябе? — абдымала Максімку маці. — Наш ты маленькі фермер...

— А хто такі фермер, мама? — пацікавіўся Максімка.

— Гэта, сынок, гаспадар, — растлумачыла маці. — Ты ж дапамагаеш нам і бычкоў пасвіць,





Правообладатель Национальный институт образования

і сена валкаваць, і ваду ў карыты з кранаў пускаеш... Пачакай, вось прыедуць яшчэ з горада людзі, перайначыцца наша глухая Росіца. Зазвіняць вечарамі на вуліцах песні...

Хутчэй бы! Бо зараз позна вечарам толькі на верандзе Максімкавага дома гучала музыка. Гэта Сяргей уключыў радыёпрыёмнік. І не ва ўсіх хатах свяціліся вокны. Мусіць, чакалі, калі прыедуць новыя гаспадары.

1. Куды пераехалі Максімкавы бацькі́ з горада?
2. Хто такі фермер? Што вы даведаліся пра яго з апавядання? Ці лёгка быць фермерам? Сваю думку пацвердзіце словамі з твора.
3. Як вы разумееце сэнс выразу «бег прыглядаць за бычкамі, каб не ўбіліся дзе ў канюшыну»?
4. Якую пасільную дапамогу аказваў сям'і Максімка? Як гэта характарызуе хлопчыка?
5. Пра што марылі дзеці і дарослыя ў Максімкавай сям'і? Прачытайце.
6. Да якога эпізоду твора падыходзіць ілюстрацыя (с. 64)? Паразважайце, якія яшчэ можна зрабіць малюнкі да апавядання.

Падзяліце апавяданне на сэнсавыя часткі. Кожнай частцы дайце загаловак. Перакажыце змест твора па плане.



Правообладатель Национальный институт образования

## ПРЫКАЗКІ

- Праца чалавека трымае і ўзбагачае, а гультайства псуе́.
- Усё, што ўмееш, тое добра.
- Хто працуе, той не сумуе.



***Кампо́ст*** — угнаенне, якое атрымліваецца ад змешвання розных адкідаў з зямлёй і торфам.
***Ток*** — спецыяльны будынак для складання, абмалоту і ачысткі збожжа.
***Зя́бліва*** — поле, узаранае з восені пад веснавую сяўбу.



### ЗМІТРОК МАРОЗАЎ

## Тата ў Ромы — аграном

Падышоў да таты Рома:
— Раскажы пра агранома. Што ён робіць? Чым заняты?..
— Добра! — сыну кажа тата. —
На сяле — усім вядома —
Не пражыць без агранома.
Летам, восенню, вясной
І марознаю зімой
Дбае ён пра ўраджай...
Кажа Рома:



Правообладатель Национальный институт образования

— Пачакай!
Не расце зімой нічога,
Вецер вые ля парога,
Поле спіць глыбокім сном…
— Ды не дрэмле аграном, —
Зноў даводзіць сыну тата. —
Зранку вельмі я заняты.
Торф і гной на поле возім,
Каб радзіла бульба ўвосень.
А яшчэ кампост рыхтуем,
На таку ячмень сартуем,
Трэба скласці план сяўбы…
Словам, тут не да гульбы!
— А вясной, — пытае Рома, —
Колькі спраў у аграмома?
Кажа тата:
— Не злічыць:
Трэба жыта падкарміць,
Поле хораша ўзараць,
Да сяўбы падрыхтаваць.





Правообладатель Национальный институт образования

А яшчэ павінен ён
Ведаць, дзе пасеяць лён,
Кукурузу і ячмень...
Корміць год вясновы дзень!

* * *

— Ну, а ўлетку, — кажа Рома, —
Мне самому ўсё вядома!
Трэба луг у час касіць,
Прапалоць і падкарміць
Буракі, капусту...
Дома
Не сустрэнеш агранома!
— І ў жніво, — даводзіць тата, —
На сяле турбот багата.
Хлебаробам не да сну,
Жнуць камбайны збажыну.
Дзень і ноч грукоча ток...
Трэба кожны каласок
Да зярнятка змалаціць...
Аграном за ўсім глядзіць!
— Ну, а восенню?
— Увосень
У мяне работ мо з восем!
Трэба
Бульбу дакапаць,
Луг на зябліва ўзараць,
Звезці лён, пасеяць жыта...



Правообладатель Национальный институт образования

— Зразумеў цяпер нібыта, —
Задумённа кажа Рома, —
Не растуць без агранома
Жыта, бульба, буракі,
Памідоры, агуркі...
Шмат прафесій у жыцці,
Толькі лепшай не знайсці!



1. З якімі пытаннямі звярнуўся да бацькі сын Рома?
2. Чаму хлопчык добра ведаў толькі летнія абавязкі свайго таты-агранома?
3. Якой працай заняты аграном зімой, вясной, летам і восенню? Прачытайце адпаведныя ўрыўкі з твора.
4. Растлумачце сэнс слоў бацькі: «Корміць год вясновы дзень!», «Увосень у мяне работ мо з восем!».
5. Якімі рысамі характару надзелены паэтам яго героі — тата і сын Рома? (Глядзіце форзац 2.)
6. Абмяркуйце, якія яшчэ ілюстрацыі можна намаляваць да верша.

**Давайце абмяркуем.** Чаму Рома лічыць, што лепшая прафесія ў жыцці — гэта прафесія агранома?



Падрыхтуйцеся да выразнага чытання верша па ролях.



Правообладатель Национальный институт образования